Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

НЯХАЙ ЖЫВЕ ПЕРШАЕ МАЯ!

ГПІБ Ср. Аз.

№ 12
КРАСАВІК.
1930

Работніцы Польшчы пад уціскам капіталу.

Капіталістычная рацыяналізацыя ў Польшчы праводзіцца шляхам узмоцненай эксплёатацыі рабочае класы. У асабліва цяжкім становішчы знаходзіцца працоўная жанчына.

Колькасць занятых у вытворчасьці Польшчы жанчын у сярэднім складае 35—40 проц. усей рабочай сілы. У шэрагу галін вытворчасьці—у тэкстыльнай, хэмічнай, тутуновай—жаночая праца даходзіць да 70 проц.

Умовы працы работніцы ў Польшчы робяцца з кожным днём усе больш цяжкімі. У большасьці заводаў рабочы дзень даходзіць да 12 гадзін. Маюцца заводы, дзе рабочы дзень даходзіць да 16 гадзін, ня гледзячы на выданы ў 1918 г. закон аб 8-мі гадзінным рабочым дні. Па гэтаму закону звыштэрміновая работа павінна быць аплачана на 50—100 проц. вышэй звычайнай. Але гэты папяровы закон, як і шэраг іншых законаў па ахове працы, нікім і ніколі ня выконваецца.

У Польшчы ня існуе роўная аплата за роўную працу. Заработная плата работніцы ў сярэднім на 35—40 проц. ніжэй заработка рабочага за аднолькавую працу. Дзённы заработак жанчыны складае ў сярэднім ад 2-х да 5-ці злотых (злоты 22 кап.). На некаторых заводах работніца атрымоўвае толькі 60 грошаў (13 кап.) у дзень. Між тым, нават па афіцыйным дадзеным польскага ўраду, пражыцьцевы мінімум для сям'і ў 5 чал. вызначаецца у 10 злотых у дзень. Такім чынам рабочы Польшчы харчуецца толькі бульбай, хлеб робіцца сьвяташным пачастункам.

Ахова працы на прадпрыемствах прадстаўляе жудасны малюнак. На паперы застаецца закон, забараняючы жанчынам і дзецям начную працу, працу шкодную для здароўя, закон аб 6-ці тыднёвым адпачынку до і пасьля радоў, аб пабудове ясьляў на прадпрыемствах і іншыя.

Кожны дзень мы бачым на заводах выпадкі, калі работніцы падаюць у обмарак ад зьнясіленьня, калі ў іх захворваюць вочы да згубленьня зроку. Так было на фабрыках Томашэўскіх, Жырардоўскіх, у Верхняй Сілезіі і інш. Каля 40—60 проц. работніц хворыя сухотамі, шмат хто хварэе псыхічным расстройствам. Хварэюць дзякуючы атруце газамі і г. д.

Зусім не здавальняюча ў Польшчы ахова мацярынства і младзенства. Па закону жанчына не павінна звальняцца з работы пасьля радоў. На практыцы, калі работніца зьвяртаецца на работу пасьля радоў, звычайна для яе ўжо работы няма, альбо яе перакідваюць на цяжкую работу, якую яна ня мае сілы выканаць і сама звальняецца з вытворчасьці. Пагэтаму цяжарная жанчына часта працуе да апошняй хвіліны, яна не карыстаецца водпускам і пасьля радоў, а стараецца як магчыма хутчэй зьвярнуцца на работу, каб яе ня звольнілі. Работніцы часта захоўваюць сваю цяжарнасьць, каб ня быць зьволенай з работы пад якім-небудзь повадам. Закон аб ясьлях зьяўляецца якой-та насьмешкай над работніцамі. Намячалася адчыненьне 250 ясьляў, з іх 35 дзяржаўных. На самай справе пабудавана ўсяго 40 ясьляў, якія служаць рэкламай фашыцкага ўраду. Работніца ня можа карыстацца гэтымі ясьлямі, бо яе заробку не хапае на ўтрыманьне дзіцяці ў ясьлях.

У цэлым шэрагу раёнаў работніцы прадпрыемств жывуць у акаляючых вёсках і зусім ня могуць карыстацца ясьлямі. Работніца не карыстаецца перапынкам для кармленьня дзіцяці. Калі работніца выходзіць з работы на поўгадзіны для кармленьня дзіцяці, яна павінна адпрацаваць гэты перапынак; ад яе патрабуюць выпрацоўкі поўнай нормы. Статыстыка аб здароўі дзяцей паказвае, што 76 проц. дзяцей польскіх рабочых хворы сухотамі. Абсьледаваньне праводзілася ў Дамброўскім басэйне, Лодзі і іншых рабочых цэнтрах.

Яшчэ горш жыцьцё сельска-гаспадарчых работніц. У Польшчы 50—60 проц. агульнага ліку батракоў складаюць жанчыны. Умовы іх працы яшчэ горшыя, чым умовы працы работніц вытворчасьці. Рабочы дзень батрачкі працягваецца ад зары да позьняй ночы. Зарплата ад 1—1½ злоты ў дзень. Яны церпяць зьверскія адносіны паноў, лаянку, біцьцё. Вельмі часты ў Польшчы збойствы батрачак. Цяжкія ўмовы батрачкі прымушаюць яе кідаць работу ў вёсцы, ісьці ў горад. Але ў горадзе знайсьці работу ня лёгка. Беспрацоўе прымушае яе займацца прастытуцыяй.

Агульны крызіс і капіталістычная рацыяналізацыя значна павялічваюць армію беспрацоўных. У сучасны момант, дзякуючы крызісу ў тэксьцільнай прамысловасьці, пачаўшамуся ў пачатку 29 году, армія беспрацоўных дасягнула вялізарных разьмераў. У тэксьцільнай прамысловасьці 50 проц. рабочых, і работніцы зусім пазбаўлены работы, астатнія працуюць ад 8 да 12 дзён у месяц. Пачалося скарачэньне і ў іншых галінах вытворчасьці. Кожны тыдзень павялічвае на 10 тысяч армію беспрацоўных. Ад 20 да 30 проц. рабочых маюць жабрацкія дапамога толькі на працягу першых 13 тыдняў беспрацоўя. Пасьля гэтага часу рабочы ніякіх пасобій не атрымоўвае. Аб жудасных умовах, у якіх жывуць беспрацоўныя, сьведчаць нататкі буржуазнай прэсы. Штодзённа пішуць аб шматлікіх выпадках, калі хуткая дапамога падбірае на вуліцах падаючых ад голаду беспрацоўных. Усё часьцей робяцца выпадкі самагубства беспрацоўных, пазбаўленых надзеі знайсьці работу і хлеб. Большасьць з гэтых ахвяр капіталістычнага рэжыму складаюць жанчыны.

Разам з абвастрэньнем эканамічнага крызісу, пагоршаньнем становішча працоўных і ўзмацненьнем наступу фашыцкай дыктатуры, расьце барацьба рабочае клясы. Пролетарыят уступае ў контр-атаку.

Рэволюцыйны ўздым расьце. Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ўсе новыя работніцы з кожным днём павялічваюць баявыя шэрагі пралетарыяту, прымаюць актыўны ўдзел у эканамічных і палітычных баех пралетарыяту.

Е. Райс.

Пралетарскае прывітаньне братом і сёстрам па клясе—ахвярам крывавага фашызму, кінутым у турмы—змагарам за сусьветны Кастрычнік.

На вокладцы—Пробны выхад у поле калгасу „Ленінскі Шлях". Фото Грына.

БАЯВЫ МАЙ.

Няхай жыве 1 Мая—баявы агляд рэвалюцыйных сіл сусьветнага пролетарыяту!

Кожны посьпех СССР—удар па сусьветнай буржуазіі. Няхай жыве Савецкі Саюз—бацькаўшчына міжнароднага пралетарыяту!

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна ўперад да новых перамог і дасягненьняў! Няхай жыве ЎсеКП(б). Няхай жыве Камінтэрн!

Першае мая—баявы дзень сусьветнага пралетарыяту, дзень калі, у адзіным фронце, згуртоўваюцца мільённыя рабоча-сялянскія масы для змаганьня з вайной, беспрацоўем, капіталістычнай эксплёатацыяй, з фашызмам і яго прысьпешнікамі—сацыял-дэмакратамі. **За дыктатуру пролетарыята! За пабудову сацыялізму ў СССР!**

Усё больш расшатваецца капіталістычны лад: вялікі эканамічны крызіс у Амэрыцы і іншых капіталістычных краінах сьведчыць аб працягваючымся распаду капіталістычнага сьвету. Капіталістычная рацыяналізацыя бязьлітасна выкідвае на вуліцу сотні тысяч беспрацоўных, абракаючы на голад мільённыя масы працоўных і ў той-жа час даводзіць да нябачаных разьмераў эксплёатацыю працуючых.

Сацыял-фашыстыя старанна дапамагаюць капіталістым праводзіць гэту рацыяналізацыю і зьніжэньне заработнай платы.

Але разам з гэтым расьце рэвалюцыйная энэргія пралетарыяту, эканамічная барацьба перарастае ў палітычную, пралетарыят пераходзіць у наступленьне: у Нямеччыне, Амэрыцы, Польшчы забастоўкі і дэманстрацыі беспрацоўных. Не дарма запалоханая буржуазія ўсяляка імкнецца перашкодзіць выступленьню рабочых 1-га Мая, рыхтуе штыкі, каб крывёю абмыць рабочыя штандарты. Здрадніцкая „рабочая" партыя ў Ангельшчыне ўжо заявіла, што яна супроць сьвяткаваньня 1-га Мая рабочымі. У Заходняй Беларусі масавыя арышты рабочых, якія рыхтуюцца к 1-му Мая.

Але, усё больш упэўніваючыся ў здрадніцтве сацыял-дэмакратыі, рабочая кляса выйдзе 1-га мая на вуліцу пад баявымі сьцягамі Камуністычнай партыі.

Пралетарыят сьвяткуе Першае Мая разам з прыгнечаным бяднейшым сялянствам, якое высоўвае лёзунг канфіскацыі абшарніцкіх зямель. Пралетарыят сьвяткуе 1-ае Мая разам з прыгнечанымі масамі працоўных калёній, дзе ўсё вышэй узьнімаецца рэвалюцыйная хваля. У Кітаі зноў растуць атрады Чырвонай арміі, у некаторых мясцох створана Савецкая ўлада.

Калі занепадае прамысловасьць капіталістычных краін, дык за тое там шпарка будуюцца прадпрыёмствы, якія даюць зброю і ўсе, патрэбныя буржуазіі, сродкі для бойкі. Ліхаманкава расьце ўзбраеньне ў Польшчы, дзе зараз уладу трымае ўрад фашыцкіх палкоўнікаў. Крыжовым паходам буржуазія таксама падрыхтоўвае глебу для новай імпэрыялістычнай бойкі, да нападу на Савецкі Саюз.

Усё гэта сьведчыць аб росьце ваеннай небясьпекі. На першамайскіх штандартах рабочае клясы ўсіх капіталістычных краін будуць лёзунгі забароны СССР—краіны будуючагася сацыялізму.



У. . Ленін на мітынгу.

Першае Мая ў Савецкім Саюзе пройдзе пад знакам пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва. Працоўныя савецкай краіны будуць дэманстраваць сваё адзінства з барацьбой сусьветнага пралетарыяту, сваю гатоўнасьць абараняць заваёвы пралетарскай рэвалюцыі.

Сацыялістычнае спаборніцтва, вялікі працоўны энтузіазм рабочае клясы—далі значныя посьпехі: першы год пяцігадовага пляну выканан з перавышэньнем. Пад кіраўніцтвам рабочае клясы бядняцка-серадняцкія масы будуюць новую сацыялістычную

ГПБ Ср. Аз.

сельскую гаспадарку. У раёнах суцэльнай калектывізацыі мы ажыццяўляем ліквідацыю кулацтва, як класы, і тым вырываем апошнюю апору буржуазіі ў нашай краіне. Мы дасягнулі гэтых посьпехаў, дзякуючы бальшавіцкаму кіраўніцтву Ленінскай Камуністычнай партыі.



Мітынг швэйцарскіх чырвоных франтавікоў.

1 Мая мы робім агляд нашых сіл. Нашы міжнародныя абавязкі перад пралетарыятам капіталістычных краін, усё ўзрастаючая пагроза вайны,—патрабуюць ад нас напружанай работы.

1 Мая спаўняецца гадавіна сацспаборніцтва. Гэта гадавіна павінна даць новыя атрады ўдарнікаў на фабрыках, заводах, у калгасах, савгасах.

Уступленьнем ва ўдарную брыгаду работніца, калгасьніца, дапамагае перамозе ў барацьбе сваіх замежных сясьцёр, дапамагае справе абароны.

1 Мая нашы лёзунгі: „Пяцігодку ў чатыры гады"! „За ўдарныя тэмпы работы"!

У вёсцы асноўнай нашай задачай зьяўляецца: замацаваньне калгаснага руху, рашучае выпраўленьне памылак, зробленых у некаторых месцах па калектывізацыі, растлумачэньне лініі партыі ў справе калгаснага руху. **Нашы лёзунгі 1-га мая: па баявому правядзем сяўбу. Ніводнага не засеянага кавалку зямлі ў калгасах і індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках.**

Выкананьнем прамфінпляну, палепшаньнем якасьці прадукцыі, бальшавіцкай сяўбой, новай арміяй ударнікаў і ўдарніц—мы б'ем ворагаў, узмацняем абарону краіны, узмацняем сілы барацьбітоў Камуністычнага Інтэрнацыяналу.

На шалёную падрыхтоўку імпэрыялістых да нападу на нашы межы, мы адкажам узмацненьнем сваёй баявой падрыхтоўкі, узмацненьнем радоў Асаавіяхіму, абараназдольнасьці Чырвонай арміі, выкананьнем пяцігодкі ў чатыры гады.

Няхай жыве баявое сьвята міжнароднай салідарнасьці—1-е Мая.

Ахвяры капіталістычнай рацыяналізацыі

(Ліст ад работніц г. Бэрліну)

Раскажам вам аб становішчы на нашым прадпрыемстве (мэталзавод Усеагульнай Электрычнай Кампаніі ў Грэнтове).

Прафбюракраты, шляхам доўгатэрміновага дагавору, навязалі нам зусім жабрацкую зарплату.

Па дагавору наша зарплата складае 70% самай ніжэйшай стаўкі рабочага-мужчыны.

Тэмп работы ў нас такі, што заўсёды даводзіць да няшчасных выпадкаў.

За апошні час былі наступныя вынікі: адна работніца ад штампавальнай машыны згубіла два пальцы на правай руцэ.

Праз два тыдні другая работніца згубіла 4 пальцы на левай руцэ. Абедзьве сталі інвалідамі.

Тое-ж наглядаецца і ў радыё-аддзеле: у часы вячэрняй зьмены, а 10-й гадзіне ўвечары 20 работніц выйшлі з строю.

З аднэй работніцай зрабіліся сударгі, у другой—нэрвовы прыпадак, 18 згубілі прытомнасьць.

Урач заявіў, што калі адна работніца губіць прытомнасьць, гэта перадаецца астатнім. Сацыял-дэмакраты ў заўкоме падтрымалі ўрача. Фірма заявіла, што яна не адказвае за астаноўку работ і пагэтаму не абавязана плаціць рабочым за прастой.

У часы выбараў у заўком мы бачылі, што большасьць рабочых падтрымоўвае апазыцыю (супроць сацыял-дэмакратаў, эсэраў, шовіністаў).

Мы будзем садзейнічаць таму, каб усе работніцы далучыліся да гэтай апазыцыі і змагаліся ў яе шэрагах за палепшаньне ўмоў працы і павышэньне зарплаты.

На конфэрэнцыі працоўных жанчын мы чулі ад вашай прадстаўніцы аб дасягненьнях у будаўніцтве вашай краіны.

Мы абяцаем вам весьці ў Нямеччыне прапаганду сярод нашых работніц і змагацца за пралетарскую рэвалюцыю ў Нямеччыне.

Група чырвоных санітарак аўстрыйскай камуністычнай санітарнай калёні (г. Вена).

Па даручэньні нашых работніц (каля 3.000 чалавек) перадаем вам рэвалюцыйнае баявое прывітаньне і спадзяемся, што вы з посьпехам будзеце працягваць ваша будаўніцтва.

Дэлегаткі заводу.

Калгасьнікі „Ленінскага шляху“ (Клімаўшчына)—прапрацоўваюць артыкул т. Сталіна: „Адказы таварышам калгасьнікам“.
Фото С. Грын.

За баявое правядзеньне сяўбы

Растлумачэньне артыкулу тав. Сталіна, выпраўленьне перагібаў і памылак, якія былі дапушчаны ў радзе месц, садзейнічаюць замацаваньню калгасаў і далейшаму разьвіцьцю каляктывізацыі.

Тав. Сталін у сваім артыкуле „Адказ таварышам калгасьнікам“ дае падрабязнае растлумачэньне памылкам, якія былі ў калгасным руху. Гэтыя памылкі былі ў тым, што парушалася добраахвотнасьць уступленьня ў калгасы, пры арганізацыі калгасаў ня ўлічвалася разнастайнасьць умоў у розных раёнах Савецкага Саюзу; у радзе месц пераскаквалі праз асноўную форму калгаснага руху—сельска-гаспадарчую арцель і арганізоўвалі адразу камуны.

Корань гэтых памылак, як кажа тав. Сталін, „у няправільным падыходзе да серадняка, у дапушчэньні гвалту ў абсягу гаспадарчых адносін з серадняком. У забыцьці таго, што гаспадарчая змычка з серадняцкімі масамі павінна будавацца не на аснове гвалтоўных мер, а на аснове згоды з серадняком, на аснове саюзу з серадняком“.



Трактарная колёна ў Клімавічах.

Гэтыя парушэньні, аб якіх гаварыў т. Сталін, былі дапушчаны ў радзе мейсц. Апошні пленум Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б даў указаньні ўсім партарганізацыям Беларусі аб неадкладным выпраўленьні гэтых памылак. Рашучае выпраўленьне гэтых памылак, ільготы, якія прадастаўлены зараз калгасам, ужо выклікалі новы прыліў беднякоў і сераднякоў у калгасы.

Зараз важнейшай нашай задачай эьяўляецца правядзеньне веснавой сяўбы. Неабходна так арганізаваць працу калгасьнікаў і калгасьніц, каб поўнасьцю выканаць пасеўны плян і яшчэ пашырыць пасеўную плошчу ў калгасах.

У гэтым павінны актыўна ўдзельнічаць дэлегацкія сходы калгасьніц, яны павінны дапамагчы ў разьмеркаваньні працоўнай сілы па брыгадам у паасобных галінах гаспадаркі.

Дэлегаткі-калгасьніцы і працоўныя сялянкі павінны дапамагчы ў правядзеньні сяўбы ў індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках.

Неабходна дабіцца пашырэньня пасеўнай плошчы ў індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках. Неабходна праводзіць растлумачальную работу, каб беднякі і сераднякі, не ўвашоўшыя ў калгасы, засявалі свае палі каляктыўна.

Калгасы, якія скончылі сяўбу ў сваёй гаспадарцы, павінны дапамагчы ў засеве маламоцным адзіналічным гаспадаркам, якія ня змогуць уласнымі сіламі засеяць усё сваё поле. Неабходна растлумачыць пастанову Саюзнага ўраду аб мерах садзейнічаньня засеву плошчы ў індывідуальных сялянскіх гаспадарках. Яна зьмешчана ў газэце „Зьвязда“ ад 14-IV г.г.

Кулак вядзе шалёную агітацыю супроць калгасаў, імкнецца перашкодзіць арганізацыі машына-конных станцый; ён агітуе беднякоў і сераднякоў не засяваць свае палі.

Сьвядомыя бяднячкі і сераднячкі не павінны паддацца на вудачку кулакам. Яны кулацкай агітацыі павінны даць рашучы адпор. Лепшым адказам на спробы ворагаў будзе арганізаваны выхад у поле, будзе баявое правядзеньне сяўбы. **А. Р.**

Да сяўбы падрыхтаваны слаба.

Савгас Дукора да сяўбы падрыхтаваны слаба. Дробны сельска-гаспадарчы інвэнтар: плугі, бароны не адрамантаваны, а толькі што скляпаны. Сяўнікі яшчэ няспраўныя.

Есьць у савгасе 4 трактары, якія будуць абслугоўваць некалькі савгасаў; яны патрабуюць добрага абыходжаньня з боку трактарыстаў, але трактарыстыя з машынамі абыходзяцца дрэнна. Былі такія выпадкі, што трактарысты, едучы з поля, узьехаў на пень і зламаў дзіскі, якіх цяпер няма.

Былі яшчэ і такія выпадкі, калі трактарыстыя, паехаўшы на працу ў другі савгас, зламалі плугі, сапсавалі трактар, ды яшчэ аблаялі кіраўніка савгасу. Трактарыстыя езьдзілі араць у суседні калгас і там стаялі доўгі час, матывуючы гэты прастой тым, нібы машына сапсавана, у той час, калі машына была спраўная.

Савгасу патрэбна 80 тон вапны для вапнаваньня глебы, а дастаўлена ў саўгас 13 тон, гэта дзякуючы таму, што зімой рацыянальна не скарыстоўваліся коні.

Явар.

Рыхтуюцца да веснавой сяўбы.

Дэлегаткі калгасу „Іскра“ в. Бяседавічы рыхтуюцца да веснавой пасеўнай кампаніі.

Два тыдні ўжо нашы дэлегаткі стаяць каля трыераў і ачышчаюць насеньне. Яны пры дапамозе двух брыгадзіраў ачысьцілі 2764 пуды насеньня. Таксама лепшых дэлегатак у ліку 9 чалавек правялі ў сябры сельсаветаў.

Бяседавічы, Хацімскага раёну, Магілеўскай акр.

Лупікаў Ф.

Батрачкі, бяднячкі, сераднячкі, у бязьлітаснай барацьбе з кулаком будуйце калгасы. Калектывізацыя разьняволіць вашу працу!

Далоў кулацтва! Няхай жыве саюз рабочае клясы і беднаты з серадняком!

Да сяўбы гатовь!

Фото Грына.

(*Калгас „Ленінскі шлях“—Клімаўшчына*).

Здалёк гэта звычайная вёска. Над саламянымі дахамі стырчаць жураўлі, а вышэй за ўсіх—слупы радыё. Гэтая былая вёска Дубравіца. Лявей—Папехінка, таксама былая, бо „Ленінскі шлях“ аб'ядняў і Дубравіцу і Папехінку і частку Слабодкі.

Мінаем 10 гэктарны сад, які летась у дзень ураджаю засадзілі.

Сонца выплыла, пакацілася па дахам, золатам заліло двары, вуліцу, поле.

На вароцях некаторых двароў—дошчачкі з надпісамі. На аднэй з іх чытаем:

„Кароўня № 2.
Кароў—16
Цялят—12,
Загадчыцца—Глушакова Марфа“

У хлявох чысьценька, цёпла, сьветла. Усіх аднолькава любіць Марфа: Манашку, Серку і Паньку, якая дае ў дзень аж 20 літраў малака.

— Цяляты калгаскія, бы на дражджах растуць. Па два месяцы, а выглядаюць выпускамі. Калісьці, як былі кожны ў асобным хлявушку—хварэлі. А зараз—здаровыя, выбрыкваюць, высока падкідаючы зады.

Недарма цётка Кавалёва людзям гаворыць:

— Калісьці ночы ня спала, ад дзіцячага роту кроплю малака адрывала цялятам і ўсё ня выходзіла карова такой, як хацелася. А зараз—у цяпле, у дабры—распросталіся каровы, нібы падрасьлі, і малака прыбавілі.

Тры разы ў дзень дояць кароў прымацаваныя дойшчыцы. Тры разы ў дзень носяць і возяць вялізныя бітоны, налітыя малаком.

Загадваць жывёльным дваром даручылі Марфе, як сябру кіраўніцтва калгасу. Марфу жартам завуць „начальнікам над каровамі“, яна-ж разьмяркоўвае працу на жывёльным двары. Але ёй не ў навінку ўжо кіраваць работаю. Яна звычна да кожнай работы.

Марфа—бяднячка. Яшчэ да калгасу парадніла жыцьцё яе з цэпам і плугам.

У калгасе-ж яна была нават старшым рабочым. Выйдзе ў поле з юнакамі, арэ, а тыя прывучаюцца каля плуга. Поле—канца-краю няма. Але многа людзей, рук, плугоў.

— Няма лепшай работніцы, як наша Марфа: гаспадарлівая, старанная. Эх, каб пісьменнасьць гэтай жанчыне!

А побач Лёкса—„начальнік над сьвіньнямі“. Лёкса скончыла курсы па сьвінагадоўлі. Старанна ўзялася за працу. Лёкса за ўсіх галасьней, пяе дробячы макуху. Толькі лічыць, што гэта праца—лёгкаватая для яе.

Лёкса—дужая здаравячка, таму вельмі імкнецца яна стаць трактарыстым.

Праца ў калгасе падзяляецца між асобнымі брыгадамі: хто ў поле, хто к жывёле, у садзе, у майстэрнях. Ня блукаюцца, чакаючы нараду, у кожнага пэўны інструмант падрыхтаваны. І кваліфікавацца лепш будуць кожны ў сваёй галіне.

А галін работы многа. Акрамя палявых работ у „Ленінскім шляху“ майстэрні, прадпрыемствы: чарапічная, цагельня, вапенны млын, вапенная печ, мукамольны млын, кузьня, кравецкая і шавецкая майстэрні.

Кузьня паказала сябе ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы: адрамантавала ўвесь інвэнтар, а плугоў, ня толькі для сябе, але і для малодшых братоў—калгасаў „Ільліч“ і „Гэрой працы“. А толькі трое кавалі.

— Тут сямі чалавекам хапіла-б работы, каб не падналеглі так. Як не старацца, вясна не чакае. Ды і нудна бяз працы—заключае старшы каваль Ісак, брызгаючы агністымі іскрамі.

У кравецкай не заціхае песьня машын. Там 7 чалавек: 3 калгасьнікі і 4 калгасьніцы.

На сьцяне расцэнкі работы. 27 розных назваў. Сярод іх—вышэйшая цана: „Паліто зімняе, на ваце—5 руб.“. І далей: „Хвартух пашыць—10 коп.“.

— Танна, танна—ківае галавою Адарка:—каб ня гэта майстэрня, колькі-б дабра давялося перацягаць прыватным краўцом.

Расцэнкі распрацаваны ня толькі ў майстэрнях, а на ўсю працу. За кожную карову даглядаць, за дзень—8 кап., за цаля—5 кап. Зьдзельшчына значна ўзьняла вытворчасьць працы.

— Хочаш больш зарабіць—стараньней працуй. Лянуешся—сам сябе лай.

Толькі старых і малых утрымоўвае калгас, ды цяжарная кабета мае водпуск за месяц да і месяц пасьля радоў.

Нажаль, ёсьць праціўнікі гэтага, то бяздзетухі.

— Мы і так гадавалі дзяцей, кажуць яны.

Але такім адзінкам варта павучыцца ў Адаркі, якая хоць і не мае малышоў, а кажа:

— Добры парадак. Ці мы ў такой вялікай сям'і ня можам вызваліць маці? Нам сорам будзе, калі здарыцца, як з маёю браціхаю калісь, якая па дарозе з поля раджаць пачала. Не, мы так жыць ня будзем, таму і калгас, каб парадкі новыя, не зьвярыныя.

Большанькіх мы ў яські, што адчыняюцца сталыя зараз, а самі з работаю ўправімся як летась, не наймаючы ніводнага чалавека.

На першым пляне—„Панька"—карова „Ленінскага шляху", якая дае 20 літраў малака ў суткі.

Так будуецца калгас „Ленінскі шлях", арганізаваны ў вясну 1929 г. з 158 двароў. „Ленінскі шлях"—прыклад для акаляючых. Яго вопыт, асабліва патрэбен нова-арганізаваным калгасам. Зусім зразумела, чаму на перагібы, на скрыўленьні лініі партыі, якія мелі мейсца ў акаляючых вёсках, сяляне адказвалі: „Мы павінны будаваць калгас так, як „Ленінскі шлях" будаваўся".

„Ленінскі шлях"—здаровы, моцны калгас. Таму асабліва ня люб ён кулацтву. Падсылалі і сюды кулакі сваіх агентаў. І калі адзін з іх, з Чэрыкаўскага раёну, зьявіўся к старому калгасьніку—Данілёнку Раману, з прамоваю: „Да-куль вы будзеце тут сядзець? Мы ўжо ўсё насеньне паразьбіралі".—Раман пугаю выгнаў з двара кулацкага агітатара.

Зараз усе калгасьнікі і нават калгасяняты „Ленінскага шляху" з гонарам заяўляюць:

— Адліву ў нас ня было і ня будзе. Мы згуртаваліся для таго, каб будаваць калектыўную гаспадарку, а не для гульні ў калектывізацыю.

Ад гэтага шалее клясавы вораг. У бясьсільлі сваім ён распускае беспадстаўныя чуткі, у іх вораг свае глыбокае жаданьне, якому ніколі не спраўдзіцца,—выдае за сапраўднасьць. Узорам гэтага зьяўляецца хлусьня, нібы „Ленінскі шлях" разбурыўся.

У „Ленінскім шляху"—36 камуністых, сярод іх 5 калгасьніц; 32—камсамольцы і 70 піянэраў. Зараз партыйная ячэйка кінула значныя сілы для замацаваньня і дапамогі ў веснавой сяўбе суседнім новым калгасам. А сам „Ленінскі шлях" сёньні вытрымаў экзамен на гатоўнасьць к сяўбе.

Сёньні песьня гучыць асабліва вясёла. Сёньні ў калгасе „Камунар" і „Ленінскі шлях" сьвята працы. Сёньня гэтыя калгасы вопытным выхадам у поле спаборнічаюць на гатоўнасьць к сяўбе. Калгасы абмяняліся дэлегацыямі.

За 5 хвілін калгасьнікі былі ў баявой гатоўнасьці. (Па ўмове сацспаборніцтва на збор вызначалася 10 хвілін).

Трактар, 70 плугоў, 20 барон, 40 чалавек з граблямі і віламі з песьнямі і чырвоным сьцягам выехалі на палі „Ленінскага шляху". Людзей сабралася нязьлічыма. Абраная камісія рукамі перамацала, пераглядзела кожную гайку, кожны вінцік.

І было-ж недавольства, калі на адным кані знайшлі пацёртыя пастромкі.

— Эх, ты, касы! І чаму-б ня ўзяць новага хамута?—гарачыліся калгасьнікі.

Вопытны выхад у поле паказаў, што „Ленінскі шлях" і „Камунар" к сяўбе ўпаўне гатовы. І таму заявілі калгасьнікі: *„Мы дырэктывы партыі аб бальшавіцкай сяўбе—выканаем"*.

„Ленінскі шлях" сьвяткуе перамогу.

У гэту вясну калгасам намечана пашырыць яравы клін процантаў на 20. Насеньня падрыхтавана. Летась ледзь расстараліся бульбы на 60 гэктараў, сёлета плошчу гэту—падвойваюць. Набыты летась авёс „Залаты дождж" даў добры ўраджай і зараз забясьпечаны насеньнем яго.

Выезд у поле—„Ленінскі шлях" Клімаўшчына.

Плянава, прадумана з усёй масай калгасьнікаў, разгортваецца гаспадарка. На паседжаньнях праўленьня заўсёды—калгасьнікі; цікавяцца, абмяркоўваюць.

„Ленінскі шлях" абвясьціў сябе цалкам ударным. Зараз разгортваецца сацспаборніцтва паміж асобнымі брыгадамі.

Трэба, каб сацспаборніцтва захапіла ня толькі гаспадарчую, але і культурную працу (ліквідацыя няпісьменнасьці, падвышэньне палітычнага ўзроўня калгасьніц). *У сацспаборніцтва трэба ўцягнуць дэлегацкі сход, работы якога амаль не адчуваецца ў калгасе.*

Творчы ўздым усёй масы калгасьнікаў сьцьвярджае, што „Ленінскі шлях" пераможа і на гэтых вучастках працы.

В. Хмялеўская.

Перадавым калгасьнікам і калгасьніцам, будуючым сацыялістычную гаспадарку ў вёсцы—першамайскае прывітаньне ад рабочых і работніц!

Правільнай арганізацыяй вытворчасьці і працы ў калгасах забясьпечым посьпех пасеўнай кампаніі і пераможнае разьвіцьцё калгаснага руху!

Палепшаньне якасьці прадукцыі—першачарговая задача

У 1929-30 г. прамысловасьць Беларусі мае бурны рост вытворчасьці. Па пляну валавая прадукцыя ў бягучым годзе павінна павялічыцца на 77 проц. За першае паўгодзьдзе вытворчасьць узрасла на 72 проц.

Горш абстаіць справа з якаснымі паказальнікамі. Дырэктыва аб зьніжэньні сабекошту яшчэ ня выканана. Замест 11 проц. фактычнае зьніжэньне складае за першае паўгодзьдзе каля 7 проц.

Недапушчальным зьяўляецца адсутнічаньне якога-небудзь пералому ў адносінах якасьці прадукцыі.

Нездавальняючая якасьць прадукцыі ў значнай меры абясцэньвае нашыя колькасныя дасягненьні.

Пацьвярджэньнем гэтага могуць служыць наступныя факты:

На запалкавых фабрыках каробкі сярнічак часта сустракаюцца зусім ненабітымі. Ёсьць выпадкі, калі пакупацель прыносіць назад сярнічкі, у сувязі з тым, што на іх няма серных галовак. Многа сустракаецца зьбітых і ломаных каробак.

З-за недагляду кіраўнікоў зьменамі наглядаюцца выпадкі, калі сярнічкі прапускаюцца без парафіну.

Кепска абстаіць справа і з якасьцю прадукцыі паліграфічнай прамысловасьці. У Гомлі з значнай партыі членскіх білетаў для ЦРК годнымі былі толькі пара кніжак. Астатнія былі кепска абрэзаны. Дрэнная і брошуроўка. Часта ў аднэй пачцы аказваюцца сшыткі розных гатункаў і рознай таўшчыні.

Вельмі дрэнна абстаіць справа і з якасьцю абутковай прамысловасьці. Так быў выпадак, калі рабочы заводу „Пралятары“, атрымаўшы па талёну пару бот, пранасіў іх усяго 8 гадзін, пасьля чаго прышлося падбіваць падэшвы.

Зусім нездавальняючае становішча склалася і ў фанернай прамысловасьці, якая, як вядома, павінна выканаць экспартны плян. Фанэра часьцяком недаклейваецца, у выніку чаго якасьць фанэры пагаршаецца і ня можа быць скарыстана для экспарту. Гэта наносіць вялікія шкоды народнай гаспадарцы.

Выпадкі пагоршаньня прадукцыі наглядаюцца і па мэталёвай прамысловасьці. Так, нядаўна, на адным з буйных заводаў „Чырвоны Мэталісты“ была забракавана да 100 шт. саламарэзак.

Часта гатовая прадукцыя знаходзіцца пад адчыненым небам і ржавее, што таксама мае ўплыў на якасьць прадукцыі.

Вельмі кепска абстаіць справа з якасьцю прадукцыі і па шкляной прамысловасьці. Так, на шклозаводзе „Ноўка“ з-за нездавальняючай якасьці прадукцыі экспартны плян выконваецца толькі ў разьмеры 50—60 проц.

Па астатнім заводам наглядаецца вельмі значны процант бою і браку, які па некаторым шклозаводам дасягае да 20 проц.

З прычыны нездавальняючай сартыроўкі, дрэннай работы красільні адзначаюцца выпадкі пагоршаньня якасьці панчох. Так: па панчошна-трыкатажнай ф-цы наглядаюцца выпадкі, калі сьветлы тавар сустракаецца з плямамі. Ёсьць выпадкі, калі путаюцца нумары панчох. Усё гэта гаворыць аб тым, што на ф-цы яшчэ недастаткова ўдзяляецца ўвага якасьці прадукцыі.

Швэйная прамысловасьць нясе вялікія страты з-за дрэннай якасьці прадукцыі. Так: пры абсьледваньні прадукцыі швэйнай фабрыкі „Акцябр“, прышлося сустрэцца з шэрагам дэфэктаў. У дамскіх паліто рукавы зьверху звужаны, сьпінкі перакошаны. Па ф-цы „Камінтэрн“ брукі разьмерам 48 былі адзеты на фігуры разьмерам 44, і лопаліся па швам.



Днепрабуд.

Увесь гэты тавар прышлося адпусьціць са скідкай на 10—15 проц.

Такім чынам, у сувязі з пагоршаньнем якасьці прадукцыі, акрамя таго, што спажывец атрымлівае дрэннае адзеньне, але і самая прамысловасьць на гэтым траціць шмат грошай.

Такіх прыкладаў можна прывесьці многа.

Усё гэта гаворыць аб тым, што **вакол пытаньня палепшаньня якасьці прадукцыі яшчэ недастаткова мабілізавана рабочая грамадзкасьць. Няма кантролю над якасьцю прадукцыі.**

Пагоршаньне якасьці прадукцыі таксама адбіваецца на рэальнай зарплаце, так як усякаму вядома, што чым горш якасьць прадукцыі, тым больш яе трэба спажываць, тым меншы тэрмін яе службы і носкі, а гэта выклікае большыя затраты сродкаў.

Неабходна, у тэрміновым парадку дабіцца ў гэтай справе карэннага пералому. Трэба, каб кожны рабочы і работніца рашуча ўзяліся за ліквідацыю тых брыдкіх выпадкаў, якія маюцца ў адносіне пагоршаньня якасьці.

Неабходна, каб сацыялістычнае спаборніцтва, якое ўжо дало шэраг прыкладаў буйных дасягненьняў, паказала і **на якасьці работы ўзоры камуністычнай працы.**

Ад таго, як справіліся тыя ці іншыя прадпрыемствы з палепшаньнем якасьці прадукцыі, трэба судзіць аб пасьпяховасьці работы прадпрыемства і ўсяго каляктыву рабочых.

А. Шульман.

ПАРА ЎЗЯЦЦА ЗА ПРАЦУ

На цукернай фабрыцы ніякай працы на падвышэньню кваліфікацыі работніц не вядзецца. Пастанова ЦК КП(б)Б ня выконваецца.

Быў невялікі цукерны калектыў, арганізаваны з беспрацоўных з Біржы працы. Працавалі яны часова, на зьмену адным прыходзілі другія. Гэта адбівалася на якасьці працы, на кваліфікацыі работніц.

З 60 работніц толькі 3 былі на кваліфікаванай рабоце. Цяпер калектыў стаў фабрыкай. Вырасла колькасьць рабочых і работніц. З 300 чалавек, працуючых на фабрыцы, каля 200 работніц. Рост у пераважнай сваёй большасьці ідзе за лік работніц. За апошні час з 75 рабочых, прынятых на фабрыку—60 работніц.

Фабрыка ў хуткім часе значна пашырыцца. Будуецца новая, добрая мэханізаваная фабрыка. Рост яе па пляну павінен быць, галоўным чынам, за лік работніц.

На фабрыцы вялікія пэрспэктывы росту жаночай працы. І таму асабліва важна добра наладзіць тут працу па кваліфікацыі работніц.

Як-жа праводзіцца тут гэтая праца?

На фабрыцы чалавек 25—30 кваліфікаваных работніц. Ды і тыя былі вылучаны выпадкова, ніхто іх ня вучыў, не падрыхтоўваў. Ніхто і цяпер ня робіць нічога на фабрыцы па кваліфікацыі работніц.

Работніцы скардзяцца на тое, што іх ня толькі не абучаюць больш кваліфікаванай рабоце, але нават не даюць ім паглядзець як другія працуюць.

Кваліфікаванай работай лічыцца на фабрыцы праца майстроў і падмайстраў, якія працуюць у асобным аддзяленьні кожнага цэху. Найбольш цяжкай работай лічыцца работа ў аддзяленьні майстроў карамельнага цэху. Туды ніяк не адважацца цяпер вылучыць жанчын. Кажуць: „Ня справяцца яны". А між іншым, тут зусім добра працуе адна жаночая брыгада з 6 чалавек, якая не адстае ад мужчын.

Астатнія работніцы ня могуць бачыць, як працуюць у другіх аддзяленьнях, яны нават ніколі ня бачылі машын, якія маюцца на фабрыцы. Прыхадзіць у другое аддзяленьне забараняецца, а экскурсій ні разу ніхто тут не арганізаваў. Пагэтаму не прасоўваецца справа кваліфікацыі работніц на фабрыцы.

„У нас ня толькі даўно нікога ў падмайстры ня вылучалі, але



Таў. Голуб'ева—ударніца зав. „Энэргія".

нават ніводнага падмайстра ў майстры ня вылучылі"—кажуць работніцы.—„Ніхто нам ніколі нічога не паказваў".

Адміністрацыя тлумачыць такое становішча з падрыхтоўкай кадраў тым, што тут большая частка работы робіцца саматужна, таму яна больш цяжкая і не падыходзіць для жанчын. Але гэта не апраўданьне. Той факт, што работніцы спраўляюцца добра і на больш цяжкай рабоце—сьведчыць аб іншым. Трэба толькі заўкому, вытворчай нарадзе,—заняцца гэтым пытаньнем, распрацаваць яго і павесьці масавую працу па ўздыму кваліфікацыі работніц. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на старых работніц, якіх неабходна перакваліфікаваць у першую чаргу, і праз іх пасьля падрыхтоўваць новыя кадры работніц. Ячэйцы трэба ўзяць на сябе кіраўніцтва гэтай справай, дабіўшыся выкананьня сьнежаньскай пастановы ЦК КП(б)Б аб кваліфікацыі работніц.

Няўважліва адносіцца да работніц старшы майстра Зыпман. Калі яны зварочваюцца да яго з якімнебудзь пытаньнем, ён замест тлумачэньня адказвае „У нас усе на фабрыцы шаўцы, краўцы". Замест таго, каб паказваць маладым майстрам як працаваць, Зыпман больш любіць ўсю віну за дрэнную якасьць прадукцыі перакладаць на маладых.

Слаба наогул культпраца на фабрыцы. Абедзенны перапынак, які цягнецца гадзіну, рэдка скарыстоўваецца для якой-небудзь працы. Большай часткай рабочыя ў гэты час бяз толку ходзяць па двару.

Э. Ш.

Спаборнічаем

(ф-ка 10-й Кастрычнік, Магілеў)

На цукернай фабрыцы ў сучасны момант налічваецца 130 чалавек, з якіх большасьць—работніцы. 8-га сакавіка ўся фабрыка абвясьціла сябе ўдарнай. На фабрыцы 10 вытворчых камун, у якіх 50 работніц. Камуны арганізаваны па ініцыятыве саміх работніц.

Паміж Магілеўскай і Менскай ф-камі заключаны дагавор па сац.-спаборніцтву, які выконваецца з правышэньнем. Сацспаборніцтвам ахоплены ўсе рабочыя фабрыкі.

Прамфінплян выканан за першы квартал па зьніжэньню сабекошту супроць мінулага году на 19,44%, а супроць пляну на 11,94 проц. Брак зьніжан на 4 проц. У мінулым годзе брак складаў 5 проц., а ў сучасны момант 1 проц. Плян па выпуску прадукцыі за 1-ае паўгодзьдзе выканан на 101,1%.

У сакавіку м-цу была перагледжана норма выпрацоўкі, пасьля чаго ў сакавіку м-цу вытворчасьць працы ўзьнялася на 21,2 проц., а зарплата на 18,9 проц. Зараз арганізавана брыгада па праверцы сацспаборніцтва і ўдарніцтва. У работу брыгады ўцягнута 10 работніц. Прагулы бяз уважлівых прычын на фабрыцы амаль зьнішчаны.

Бэрына.

Першамайскае прывітаньне перадавікам сацыялістычнага спаборніцтва, героям камуністычнай працы—ударнікам і ўдарніцам.

ДЗЕНЬ ДРУКУ

Друк—калектыўны агітатар і арганізатар працоўных мас у сацыялістычным будаўніцтве.

5-га мая праводзіцца „Дзень Друку“. Пралетарскі друк у нашай краіне адыгрывае вялікую ролю ў справе сацыялістычнага будаўніцтва нашай краіны.

Праз пралетарскі друк мільённыя масы працоўных арганізуюцца вакол камуністычнай партыі для выкананьня баявых задач сацыялістычнай будоўлі. Праз друк рабочая кляса і працоўныя масы сялянства змагаюцца з недахопамі і перашкодамі, якія маюцца ў нашай рабоце.

Кампанія дню друку ў гэтым годзе ў нас павінна прайсьці пад знакам яшчэ большай **мабілізацыі працоўных мас вакол выкананьня генэральнай лініі партыі, на выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, на выкананьне і перавыкананьне прамфінплану, на замацаваньне і далейшае разгортваньне калгаснага руху, на ліквідацыю ў раёнах судэльнай калектывізацыі кулацтва як класы.**

Кампанія дню друку павінна прайсьці пад знакам рашучай барацьбы з правай небясьпекай як галоўнай на данным этапе, з „левымі“ загібамі, з нацыянал-згодніцтвам, беларускім нацыянал-дэмакратызмам і з усімі іншымі шовінізмамі.

У гэтую кампанію **трэба шырока растлумачыць сучаснае міжнароднае становішча, рост антысавецкай кампаніі і нябесьпекі вайны; трэба мабілізаваць увагу працоўных на ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны і інтэрнацыянальныя сувязі працоўных усяго сьвету.**

Трэба ў гэтую кампанію праверыць, як выконвае наш друк свае задачы—мабілізацыі мас вакол выкананьня генэральнай лініі партыі, як разгортвае на сваіх старонках самакрытыку.

Шырокія масы работніц і працоўных сялянак Беларусі павінны праверыць, наколькі наша часопісь адказвае на запатрабаваньні працоўных жанчын, наколькі яна згуртоўвае іх вакол баявых задач сацыялістычнага будаўніцтва. Чытачкі часопісі павінны ў дзень друку заўважыць недахопы часопісі, паставіць іх на абгаварэньне мас, каб яшчэ больш замацаваць цесную сувязь часопісі з масай працоўных жанчын.

Зараз перад часопісьсю, у сувязі з рэарганізацыяй партапарату, стаяць адказьнейшыя задачы. Работа сярод жанчын зьяўляецца работай усей партарганізацыі і часопісь павінна дапамагаць згуртаваньню вакол задач партыі работніц, батрачак і працоўных жанчын; разам з гэтым, змагацца з выпадкамі недаацэнкі работы сярод жанчын з боку асобных працаўнікоў, выкрываючы тых, хто замест таго, каб зрабіць яе агульна-партыйнай,—спыняюць, альбо скарачаюць яе.

Ладзяць ленкуток у польскім калгасе імя Дзяржынскага(Гом. акр.)

Часопісь павінна яшчэ больш дапамагаць работніцы ў яе барацьбе за промфінплян, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, за падвышэньне сваёй кваліфікацыі, прыцягваючы ня толькі работніцу-актывістку, але адсталую, новую ў вытворчасьці, работніцу ў рады ўдарніцтва.

Часопісь павінна змагацца за тое, каб дапамагчы бяднячцы і сераднячцы ў перабудове сваёй гаспадаркі і быту на новы лад, рашуча выкрываючы спробы кулацтва скарыстаць няпісьменнасьць працоўных жанчын для перашкоды ў калектывізацыі.

Чытачкі праз сваю часопісь павінны змагацца за стварэньне новага быту, за пашырэньне грамадзкага харчаваньня і грамадзкага выхаваньня дзяцей. Перад узрастаючай небясьпекай вайны, часопісь павінна рыхтаваць працоўных жанчын да справы абароны краіны.

Разгортваньне самакрытыкі зьяўляецца важнейшай задачай. Працоўныя жанчыны павінны праз сваю часопісь яшчэ больш змагацца, яшчэ сьмялей выкрываць недахопы ў вытворчасьці, у калгасах і савгасах, у савецкіх установах; выкрываць скрыўленьні партыйнай лініі.

Па асобным пытаньням працы, быту, вылучэньня, культуры часопісь будзе ствараць брыгады з раб-селькорак.

Дзень друку павінен узмацніць рады рабкорак і селькорак нашай часопісі.

Дзень друку павінен яшчэ больш прасунуць часопісь у масу працоўных жанчын.

У дзень друку мы чакаем водгукаў чытачак на заклік кожнай чытачцы завербаваць 5 новых падпішчыц.

Ударны цэх ф-кі „Чырвоная Бярэзіна ў Барысаве“.

Супроць правых апортуністых—выказчыкаў кулацкай ідэалёгіі і левых загібшчыкаў—саюзьнікаў правых! За генэральную лінію партыі!



Маладая маці

Яна стаяла каля машыны на вялікай фабрыцы. Яна стаяла там ужо з даўняй пары, з тэй пары, калі была яшчэ амаль дзіцём і насіла кароценькую сукеначку. Ёй вельмі рана давялося ўзяцца за працу, вельмі рана для яе маленькага жыцця. Бацька яе загіб дзесь на вайне, а маці хутка завяла сабе другога мужа.

Тады Маргарыта Іммэрверг пашла з дому, прышла ў вялікі шэры горад, знайшла сабе маленькую каморку і мейсца каля машыны, на фабрыцы.

І вось яна стаіць зараз каля машыны—як заўсёды. Але дзіўная справа, сёньня ўсё ня так, як раней; сёньня па другому, многа сумотней. На ілбу ў Маргарыты лягла глыбокая заклапочанасьць. Яна часта апускае вочы на сваё маладое цела і ціха праводзіць па ім рукою.

Наглядчык зьвярнуў увагу, што яна некалькі разоў забывала аб рабоце, прыпыняла машыну, нарэшце ён страціў цярпеньне, падышоў да яе і глуха вылаяўся.

Маргарыта спалохалася. Ёй здалося, што яе таямніцу выкрылі, і зараз-жа яна падумала аб тым, як гэта будзе кепска, калі яе цела папаўнее, пачнуцца болі і... нарэшце, у адзін прыгожы дзень... Яна ледзь здолела скончыць сваю думку, сьпяшаючыся ўзялася яна зноў за працу.

* * *

Камора зьняволенага была малая і халодная: пяць крокаў у шырыню, шэсьць у даўжыню. Шэрыя каменныя сьцены, цьвёрдыя нары і цамантовая падлога. Зусім зьверху, у кутку, было маленькае вакенца, скрозь яго ўсьміхалася блакітнае неба, але гэта ўсьмешка была скажана жалезным пераплётам кратаў.

Зьняволены мёрз. Ён быў яшчэ маладым, але сьвежасьць яго маладосьці павінна была згінуць ад доўгага прабываньня ў турме. Ён ведаў гэта... Гэты зьняволены з вялікім голадам у вачах, апыніўшыся за кратамі толькі таму, што вельмі гучна заявіў аб сабе на волі. У думках ён убачыў весь малюнак, папярэдні жудаснаму зьняволеньню.

Горад, рабочая дэмонстрацыя, ён—таксама рабочы, маршыруе разам з усімі, вуліца вельмі шырокая, але для ўпрыгожанага сталёвым шлемам матацыкліста—вуліца недастаткова шырокая, і ён чапляе і цягне за сабою аднаго рабочага, пакуль абое не падаюць у канаву.

Рабочы лаецца—яго галава разьбіта ў кроў. Матацыкліст таксама лаецца, пасьля ён з пагражаючым выглядам падыходзіць да рабочага.

Наўкола зьбіраецца натоўп, падходзяць і дэманстранты, за імі паліцыя, адбываецца даўка, чуваць асобныя крыкі, усе страшэнна ўзбуджаны, пачынаецца шум.

Але вось стрэл. Усе бягуць. Нарэшце застаюцца толькі два паліцэйскіх, арыштаваны рабочы, тры ўсхвалёваных сьведкі і маладая кабета. Кабета глядзіць на рабочага і з ганебнасьцю гаворыць:

— Які наглы твар.

Рабочы з стомленай усьмешкай паціскае плячыма. Пасьля яго вядуць паліцэйскія.

Пасьля судовы працэс. Матацыкліст зусім здаровы і сядзіць на лаве сьведак. Побач з ім усьміхаецца маладая кабета. Саля поўна людзей.

Справа пачынаецца. Роўны голас нібы здалёк, чытае абвінавачальны акт. Рабочы, за кратамі, слухае, ківае галавой. Ён ня можа паверыць таму, што ён такі кепскі чалавек. Але людзі на сьведчай лаве, і ў мясцох для слухачоў, часткова з зьнявагай, часткова з жалем ківаюць галовамі.

Канец быў сумны. Рад артыкулаў абвінавачваемага заключэньня прызналі даведзенымі: прыгавор—тры гады турмы.

Зьняволены стомлена ўсьміхнуўся. Але вось перад яго вачыма ўсплыў заплаканы твар аднэй дзяўчыны. Ён пачаў усхвалёвана хадзіць па каморы і правёў сябе рукою па ілбу.

— Маргарыта!

У яе павінна быць дзіця. Так, бо за дзень да арышту ён быў у яе—і яны моцна абнімалі адзін аднаго... І Маргарыта была так пяшчотна, зараз у яе будзе дзіця, а ён сядзіць у турме і ня можа нічога для яе зрабіць.

Ці будзе Маргарыта досыць моцнай? Ці не баіцца яна дзіцяці? О, калі-б ён мог дапамагчы, хоць-бы толькі ў часы родаў.

Зьняволены спыніўся пад вакном, закусіў губу. Ён добра ведаў, што турма з яе жалезным статутам застанецца бязьлітаснай к яго бядзе. Ён ведаў: калі Маргарыта нават памрэ, яго ўсёроўна ня выпусьцяць з каморы. Памілаваньня няма.

Лёс быў жорсткі, але ён хацеў перанесьці яго бяз скарг. Нечакана ў яго паявілася мужнасьць, мужнасьць пакуты. Маргарыце давядзецца многа вытрымаць — яе будуць катаваць і зьневажваць; калі яна досыць моцная, яна будзе змагацца, абараняцца і рашуча ўступіцца за жыцьцё свайго дзіцяці, яна застанецца такой пекнай, як і раней. Калі-ж яна слабая, калі згіне і ён знойдзе яе змучанай і

разьбітай... Так, ён хацеў быць моцным.

Дзьверы ў камору адчыніліся. На парозе стаяў вартаўнік. Ён пагладзіў сваю бараду і загадаў зьняволенаму выйсьці, яго голас гучэў бязжыцьцёва і суха.

З паднятай галавою пакінуў зьняволены сваю халодную камору.

* * *

Маргарыта Іммэрверг ужо больш не стаяла каля машыны.

Яна ляжала ў пасьцелі. І маленькая каморка ацапянела ад яе крыкаў. Напружанае цела дрыжала ад пакуты. Але маленькая каморка была пустая, і стогны спакутаванай дзяўчыны разьбіваліся аб сьцены, нікім ня ўчутыя.

Увечары прышла стукаючы ботамі высокая жанчына. Яна загадала старой гаспадыні прынесьці гарачае вады і вылажыла з свайго чамадана нейкія рэчы.

Спакутаваная Маргарыта плакала і глядзела на высокую жанчыну просячым дапамогі ўзглядам. Але ніякага цуда не здарылася, боль, як і раней гарэла і разрывала нутро.

Да самае ночы маленькая каморка была сьведкаю роспачы, крыкаў і поўнай зьнямогі. Высокая жанчына сядзела зусім бязудзельнай к гэтым пакутам.

Маргарыта чакала сьмерці.

Але вось паявілася дзіця. Яго паяўленьне суправодзілася крыкам маладое маткі, якая з зачыненымі вачыма адкінулася назад, ляжала як няжывая.

Высокая жанчына выканала свае абавязкі. Дзіця зараз-жа закрычала, але маладая маці адчыніла вочы толькі тады, калі адчула на сваіх руках загорнутае ў рызьзё дзіця. Тады яна ўсьміхнулася.

Высокая жанчына хутка вышла, яе зьмяніла старая гаспадыня, стала спачуваць беднай мацеры і заспакойваць.

Але Маргарыта, чакаючы жорсткай будучыні, не падала духом. О, у яе хопіць мужнасьці ўступіць у барацьбу з жыцьцём. Якія-б суровыя і бязьлітасныя ня былі чакаўшыя яе дні. Вечарамі яна будзе зварачвацца к свайму дзіцяці, зьбіраць новыя сілы для змаганьня з заўтрашнім днём.

Мужнае супакойства адбівалася на твары маладое жанчыны. У маленькай, беднай каморцы ляжала маці-гэроіня. Яна бачыла перад сабою каменную, турэмную камору — і ўсьміхалася. Яна бачыла зьняволенага, якога любіла, які з каханьнем думаў аб ёй і ўжо так доўга, доўга—далёка адсяе,—і ўсьміхалася. Яна верыла, што настане дзень, калі яна разам з ім пачне барацьбу. Яна верыла ў перамогу над усімі ценямі сучаснага. Яна верыла ў сябе і ў яго, ва ўсіх братоў і сясьцёр усяго сьвету.

Дзіця спала. Маладая маці адчула нібы раступіліся сьцены і рашчыніўся дах.

Сонечныя хвалі калыхаліся наўкола пасьцелі. Здалёк даносілася песьня ідучых людзей. Палынелы сьцяг датаркнуўся да пасьцелі. А з бесканечнасьці сьпяваў гудок... Так, сьпяваў...

Ціха ўздыхнула сьпячая маці. Там, здалёк, палаў горад. З завешаных вокан падаў нярухомы сьвет. Апошнія крокі глуха замерлі ў цёмным завулку.

* * *

Маргарыта зноў стаяла каля машыны. Працаваць з халоднымі коламі і вагарамі здавалася ёй яшчэ цяжэй, зараз, калі яна стала маткаю. Дзіця знаходзілася пад наглядам старое гаспадыні. Маці бачыла яго толькі па вечарам і некалькі момантаў раніцою, перад дарогаю на фабрыку. Гэта было цяжка.

Але інакш не магло быць. Хто-б паклапаціўся аб матцы і дзіцяці? Закон, адабраўшы ў яго бацька, ня меў у сабе ніякіх артыкулаў, якія-б гаварылі аб дапамозе тым, хто на сабе адчуў яго сілу. О, не, ён прыгаварваў і гэтага было дастаткова—навошта яму было псаваць сваю справу?

Дзень быў цяжкі, як цяжкая хмара. Час-ад-часу маці ўздыхала. Але пасьля пачынала думаць аб сыну.

Яна павінна паведаміць яму размах, каб ён прабіўся праз жыцьцё, а ня краўся палахліва збоку. Бяда яму, калі, зьнясілены мацярынскай палахлівасьцю, ён нясьмела згібне ў навальніцы часу. Інакш—лепш бы ёй не раджаць.

Зварочваючыся ўвечары ў сваю каморку, яна прачытала на вулічным слупе крычаўшую абвестку аб палітычным сходзе, на якім павінны выступаць работніцы. Мімаволі яна падумала аб зьняволеным бацьку свайго дзіцяці.

— Пайдзі, пайдзі туды.

Нэрвова правяла яна рукою па ілбу, нібы жадаючы струсіць з сябе нешта жудаснае. Вялізарнае

пытаньне стала перад ею: „А дзіця, тваё дзіця?!“

О, як яна марыла цэлы дзень, прыціснуўшы маленькае цельца да сваіх грудзей, удыхнуць нежны арамат маленькага чалавека, і разам з ім упіцца яго чарамі. Няўжо яна павінна адмовіцца ад гэтай асалоды?

— Не, не, не,—шаптала яна баязьліва, паскараючы крокі.

Усюды яна бачыла гэты вялікі, заклікаючы плакат з словам „жанчыны“. Яе палітычная сьвядомасьць абудзілася. Яна ніколі не адставала, заўсёды яна была ў першых шэрагах, да той пары, пакуль не нарадзілася дзіця.

... І яна хацела змагацца за новае жыцьцё, за жыцьцё, якое таксама ўпрыгожыць дарогу яе дзіцяці.

Калі яна застанецца каля свайго дзіцяці, ня хопіць толькі аднаго змага ара. Але ўсё-ж ня хопіць... Адно зьвяно выпадзе. А што калі справа ўся ў гэтым зьвяне?

Калі яна прышла дамоў, яна ўжо ведала, што пойдзе на сход. Дзіця ляжала ў яе на грудзях. Маленькія ручкі краталіся ва сьне, шукалі, нібы хацелі затрымаць нешта пекнае, схапіць і моцна ўчапіцца.

Маладая маці задрыжала. Адзін момант ана хісталася, але зараз аўладала сабою. Яна павінна ісьці.

І яна пайшла. Прыціснула да сябе яшчэ раз дзіця і пасьля пасьпешна зьбегла па ступеням. На вуліцы яна спынілася. Сьвет і

людзі акалялі яе. Яе сэрца моцна білася: „Ты, ты... ты...“

Старая гаспадыня ківала галавою. Яе зьдзівіла такая „бессардэчнасьць“ і яна ціха вылаялася пра сябе.

Перад самай саляй Маргарыта зноў спынілася і з стукаючым сэрцам ўспамянула дзіця. Але пасьля распросталася і цьвёрдым крокам вайшла ў салю, да гэтых людзей, якія пакутавалі таксама, як яна, хоць і ня ўсе з іх пакінулі дома бездапаможнае дзіця.

Усёроўна, яны пакутавалі і змагаліся, як яна.

Жанчыны гаварылі доўга. Яны выклікалі горач самых захаваных куточкаў жыцьця, яны выкрывалі пакуту і несправідловасьці.

Маргарыта бачыла ўласнае жыцьцё, чула ўласныя скаргі, адчувала ўласны вялікі боль. І ў галавах усіх людзей, сядзеўшых і стаяўшых у гэтай салі, бушавалі тыя-ж думкі і перакананьні, пашыраліся, перапляталіся і разгарнулі моцную сетку, у якой усе яны былі спайманыя. Разам яны біліся ў гэтай сетцы жабрацтва, разам трэба з гэтай сеткі вызваляцца.

Такое было агульнае пачуцьцё.

З гэтага пачуцьця вырасла сіла, для абурэньня, для змаганьня за свае права.

Нарэшце выступіла і Маргарыта. У яе было такое пачуцьцё, нібы яна трымала на руках сваё дзіця, і павінна была паказаць яго зараз усім сваім братом і сёстрам і гучна ўскрыкнуць:

„Гэта—дзіця! Дзіця! Гэта—цэлы сьвет!“

Прыціснула да сябе яшчэ раз дзіця.

Але пасьля яна адчула сябе зусім вольнай і пачала гаварыць. Яна гаварыла аб жорсткім жабрацтве, аб цяжкай пакуце, аб самаахвяраваньні для ідэі.

Работніцы слухалі яе, перад імі гаварыла новая, мужная маці, якую ня схіліла цяжкае жыцьцё.

Нязьлічымыя вочы з надзеяю ўпіваліся ў яе, купаліся ў яе словах і загараліся новым, жывым полымем.

— Мы, мацяркі, павінны пакінуць калыскі сваіх дзяцей і пайсьці супроць ворага іх маладога жыцьця. Мы пакідаем сваіх дзяцей ў барацьбе за кавалак чорствага хлеба... Мы павінны таксама мець мужнасьць пакінуць іх у барацьбе за ўвесь сьвет,—сказала Маргарыта і вярнулася на сваё месца.

У глыбіне салі пачулася песьня. Саля задрыжала пад магутнымі гукалі гэтае песьні.

Маргарыта пела таксама. Калі яна ішла дамоў, яна несла ў грудзях перамогу над сабою, над сваёй апошняю слабасьцю.

І маці стала жалезнай—жалезнай з палаючым сэрцам.

* * *

Зьняволены сядзеў у сваёй каморы і чытаў пісьмо. Гэта пісьмо гаварыла простымі словамі аб дзіцяці і мацеры, якая мела мужнасьць пераносіць пакуту, каб дамагчыся перамогі. Зьняволены пацалаваў белы аркуш паперы, у яго лёгка было на сэрцы. Ён устаў, падышоў да вакна і паглядзеў на сьвет, і на шляху яго ён бачыў маладую рашучую маці, ідучую наперад... праз усе перашкоды.

Ганс Лербэр.

(У скарочаным выглядзе пераведзена з расійскае мовы)

Галодныя беспрацоўныя капіталістычных краін начуюць пад сьцяной на вуліцы.

У такіх падвалах жывуць рабочыя капіталістычных краін.

Братэрскае прывітаньне работніцам, батрачкам і працоўным сялянкам Польшчы і Заходняй Беларусі, якія гэраічна змагаюцца з фашысцкім уціскам.

УЗМАЦНІМ АБАРОНУ СССР.

Драпежнікі замежнага капіталу імкнуцца сарваць плян вялікіх сацыялістычных работ у СССР. На лясканьне зброяй адкажам згуртаваньнем нашых сіл.

Работніцы і працоўныя сялянкі! Уступайце ў Асоавіахім, узмацняйце абароназдольнасьць СССР!

Тав. Варашылаў.

Ячэйка Асоавіахіму працуе.

На пагрозы буржуазных акул разбурыць адзіную краіну Саветаў—дэлегаткі калгасу „Іскра", Хаціімскага раёну, адказваюць масавым уступам у шэрагі Асоавіахіму.

Калі ў сьнежні месяцы сяброў налічвалася толькі 9 асоб, то ў сакавіку мы маем ужо 37 асоб. На дабраахвотныя ўзносы сродкаў і здачу мэталёвых рэчаў, ячэйка набыла адну дробнакалібравую вінтоўку, 2 працівагазы і некалькі іншых вайсковых прыладаў.

Акрамя тэарытычнай падрыхтоўкі ў гуртку праводзяцца вайсковыя заняткі.

Ячэйка Асоавіахіму праводзіць экскурсіі ў бліжэйшыя вёскі, дзе вядзе агітацыю за большы ўступ у Асоавіахім, Мопр і іншыя грамадзкія арганізацыі.

Калгас „Іскра", Бяседавічы, Хаціімскага р-ну, Маг. акр.

Н. П. Лушікава.

Работа Чырвонага Крыжу

(Магілеў)

Да 8 сакавіка таварыствам Чырвонага Крыжу адчынена дзіцячая консультацыя у вёсцы Брацькавічы, Касьцюковіцкага раёну. Ад-

пушчана 500 руб. на ясьлі ў Быхаўскім раёне.

У аграпаходзе ўдзельнічала 13 дружыньніц, якія дапамагалі ў мэдабгляду сялян, актыўна ўдзельнічалі на сходах па правядзеньню калектывізацыі.

У карысьць дапамогі байцом Дальне-Ўсходняй Арміі сабрана па гораду 345 рублёў, на якія закуплена месца ў санаторыю і дом-адпачынку. Дружыньніцы Чырвонага Крыжу выяжджалі з урачэбнай брыгадай на раёны, дапамагаючы хворым сялянам.

У 5-ці дзённым зборы перамеьнікаў удзельнічалі 20 сяськёр-дружыньніц Чырвонага Крыжу, якія арганізавалі мэдпункты і праводзілі, пад кіраўніцтвам вайсковай санчасткі, мэдагляд, удзельнічалі ў стральбе. На мясцох збору, па Магілеўскаму раёну, было арганізавана 4 бясплатных гарбатні, у якіх былі сангурткі, з адпаведнай літаратурай і плякатамі.

Дружыньніцы праводзілі гутаркі аб Чырвоным Крыжу; завербавалі 200 сяброў і арганізавалі 4 ячэйкі Чырвонага Крыжу.

Грэўнева.

Гурток „Першай дапамогі"—жакг № 16—Менск

Узмацненьнем сацбудаўніцтва—адкажам на крыжовы паход.

Звыш 500 працоўных Глуску вышлі на мітынг пратэсту супроць крыжовага паходу, абвешчанага крывавым папай Піям.

„Яшчэ больш напружыць сілы для сацыялістычнага будаўніцтва, адлічыць 2 проц. месячнага заработку на трактарную калёну. Мы ў мазалістых руках моцна трымаем вінтоўку, гатовы абараніць заваёву Кастрычніка"—вось як адзінадушна адказалі на крыжовы паход працоўныя Глуску.

Уфлянд Паша.

Глуск.

17 ДЗЕНЬ. Гутарка аб 1-ым Маю. Чытаньне артыкулу „1-га Мая“.

Вылучэньне літары „Дз“ у словах „Людзяневіцкі“, „прыглядзеўшыся“.

За калектыўную працу.

Калгасьнікі Людзяневіцкага с/с выехалі ўзараць першую баразну. Ім на дапамогу выйшлі піанэры і вучні, якія разьбівалі гной, засеялі бульбу.

Сяляне ўбачылі калектыўную працу, пазапрагалі коняй і таксама выехалі ў поле.

Дружна ўзаралі калгасьнікі зямлю, якая была намечана на сёнешні дзень.

У гэты дзень, прыглядзеўшыся да працы калгасьнікаў, нават тыя сяляне, якія ня ўступілі ў калгас, зразумелі, што супольная праца спарнейшая. Тады, ня ўступіўшыя ў калгас, сяляне таксама сталі працаваць калектыўна, згуртаваўшыся па 20—25 гаспадарак: вывозяць гной, пачынаюць яны сяўбу.

Лагун Матрона.

Наперад!

У калгасе „Чырвоны Каапэратар“ 28 гаспадарак—адданых калектывістых. Зжыты хістаньні. Працдысцыпліна аздаравілася, актыўнасьць узьнялася. Гэтаму спрыяла прапрацоўка „Адказаў калгасьнікам“ т. Сталіна, а таксама ільгот калгасам. Калгасьнікі ўжо вышлі ў поле.

— Наперад — крычаць Тэкля Даніленкава і Параска Новік, ідучы на чале брыгады плугароў, узворваючы першыя ральлі на калгасным полі.

„Наперад“ — перадаюць адзін другому мужчыны, дружна зьнішчаючы межы на пахаці...

„Наперад“ —хочацца крыкнуць ўсім працоўным.

Шымкевіч.

В. Рудня, Хойніцкі раён.

Рабочыя і працоўныя сялянкі! На барацьбу з п'янствам, антысэмітызмам, папоўска-сэктанскім дурманам!

За пісьменнасьць, за культуру, за новы быт!

Трактарная станцыя ў Койданаўскім раёне.

Што неабходна для адчыненьня яськяў?

У гэтым годзе, у сувязі з масавай арганізацыяй калгасаў, узьнікае вялікая неабходнасьць стварыць шырокую ясельную сетку ў калгасах. Сельскія яські, арганізуючыяся зараз на час палявых работ, аслабаняюць матку-калгасьніцу ад дзяцей і даюць ёй магчымасьць удзельнічаць разам з мужам у агульным будаўніцтве калгаснай гаспадаркі. Летнія яські, якія апраўдаюць сябе ў рабоце, і дзе магчыма будзе забясьпечыць іх матар'яльнымі сродкамі, змогуць працягваць сваю работу і ўзімку.

Яські, дзетсады і пляцоўкі — нашы культурныя ячэйкі, дзе ня толькі дзецям, але і маткам ёсьць чаму павучыцца. Да адчыненьня яськяў неабходна правесьці, загадзя, падрыхтоўчую работу; адшукаць памяшканьне, прывесьці яго ў парадак, падабраць працаўнікоў, правесьці адбор дзяцей, заказаць мэблю і абсталяваньне (посудак, бялізну). Работу гэту трэба сваячасова зрабіць, каб к часу найбольш гарачых палявых работ адчыніць яські.

Падрыхтоўчая работа праводзіцца ясельнай камісіяй, куды ўваходзяць прадстаўнікі ад розных арганізацый: РВК'а, каапэрацыі, жанарганізатар, урач, ад мацярок.

Актыўны ўдзел у арганізацыі яськяў павінны прыняць бацькі. Мацяркі змогуць пашыць бялізну, прывесьці памяшканьне ў парадак. Гэта скароціць выдаткі па арганізацыі яськяў, а таксама маткі зацікавяцца работай яськяў.

Неабходна, па магчымасьці, імкнуцца, каб яські ня былі далёка ад мэдычнага пункту, для таго каб наладзіць частыя наведваньні ўрачом яськяў, у выпадку якіх-небудзь захворваньняў магчыма тэрмінова выклікаць урача і пазбавіць астатніх дзяцей ад заражэньня, аддзяліўшы хворага.

Памяшканьне пад яські павінна быць прасторным, сьветлым і сухім. Па магчымасьці кожнай групе трэба прадаставіць 2 пакоі: спальню і другую для гульняў і сталовай.

Апрача спальняў адзін пакой трэба адвесьці пад ізалятар, куды да прыходу маткі зьмяшчаюць захварэўшае дзіця.

Кухню і пральню трэба пабудаваць на двары, пад навесам, і толькі ў крайнім выпадку—там, дзе памяшчаюцца дзеці. Калі хата, адведзеная пад яські, малая—кожнай групе адводзіцца адзін пакой і ў такіх выпадках, пасьля дзённага сну, палатняныя ложачкі трэба паскладаць і вынесьці, каб дзецям было дзе пабегаць.

Пры выбары памяшканьня для яськяў трэба імкнуцца, каб быў сад альбо двор, які магчыма скарыстаць для пляцоўкі і заняткаў дзяцей. У сонечныя, летнія дні дзяцей трэба трымаць на паветры. Тут-жа дзеці сьпяць, гуляюць. Для гэтага неабходна прыстасаваць пляцоўку ачысьціць і прывясьці яе ў лад, прыладзіць доўгія сталы і лаўкі.

Мэбля для яськяў патрэбна наступная: невялікія чатырохкутныя столікі (80×80 м.) крэсьлечкі з сьпінкамі, а для малышоў з падлакотнікамі, вешалкі з палічкамі для рушнікоў дзіцяці, асобныя чашкі для паласканьня роту, умывальнікі, шахвачкі для посудку, цацак, ложачкі.

Гігіенічней і прыгажэй, калі мэбля ахварбована ў сьветлыя прыемныя для вачэй колеры (блакітны, ружовы, жоўценькі).

Па разьмеру мэбля павінна быць прыстасавана да росту дзяцей. Ложачкі для малышоў трэба зрабіць дрывяныя з рашоткамі, для старшых—палатняныя на сталюжках.

Вопратка для дзяцей у летнія дні вельмі простая: трусікі альбо камбінацыі. Вопратка павінна быць вручнай, слабоднай і не перашкаджаць руху дзіцяці. З посудку патрэбна: місачкі для супу, талеркі і сподачкі для мяса. З гігіенічнага боку раіцца алюміневы посудак, але ён вельмі хутка награваецца, таму для яды дзіцяці лепш купляць эмаліраваны, альбо фаянсавы посудак.

Дзіцячыя яські ў калгасе.

Летнія яські звычайна разьлічаны на 25—30 дзяцей. Прымаюць дзяцей у яські толькі здаровых.

Разнародны ўзрост дзяцей перашкаджае правядзеньню выхаваўчай работы ў яськях. Таму пры разьмеркаваньні дзяцей на групы трэба ўлічваць ня толькі ўзрост, але і разьвіцьцё дзяцей.

У летнія яські прымаюцца дзеці ад 6-ці да 4-х год. Груднікоў маці павінна ўзяць з сабою ў поле, каб карміць яго грудзёю. Дзяцей падзяляюць на 2 групы, звычайна так: 1-ая група: ад 6-ці месяцаў да 2-х год; 2 ая група: ад 2-х да 4-х год. Калі пападаюцца кволыя дзеці 2½ гадоў, іх памяшчаюць у малодшую групу і наадварот: добра разьвітае дзіця, да 2-х гадоў—пападае ў старшую групу. Больш 12—15 дзяцей у малодшую групу не раіцца прымаць; у старшай можа быць да 20-ці дзяцей.

Яські на 25—30 дзяцей абслугоўвае звычайна 4 чалавекі пэрсаналу: загадчыца яськямі, сястра, няня, кухарка.

Абавязкаў у загадчыцы шмат: яна вядзе работу, ляпей, у малодшай групе, бо гэтыя дзеці больш сьпяць і ёй лягчэй адарвацца для другой работы. Загадчыцца вядзе гаспадарку, справаздачнасьць, наглядае за ўсім пэрсаналам і работай яськяў.

Сястра праводзіць усю выхаваўчую працу з дзяцьмі ў сваёй групе. Няня павінна, галоўным чынам, дапамагчы ў рабоце з малодшай групай і прыбіраць памяшканьне.

Усё гэта неабходна ўлічыць пры арганізацыі яськяў. К часу адчыненьня ўся падрыхтоўчая работа павінна быць праведзена.

Чорная.

ПАРАДЫ АГРАНОМА

Пашырым садоўніцтва.

Садоўніцтва ў Беларусі мае спрыяючыя ўмовы для разьвіцьця, дзякуючы добраму клімату, глебе, добрым умовам збыту і шляхоў зносін.

Зараз па БССР лічыцца каля 15.000 гэктараў садовай плошчы; фруктаў штогодна зьбіраецца да 50.000 тон, з якіх за межы БССР вывозіцца да 27—30 тысяч тон; апошнія гады, дзякуючы блізкасьці заходня-эўропэйскіх рынкаў, БССР пачала вывозіць яблыкі, выключна антонаўку, у іншыя краіны, галоўным чынам ў Нямеччыну, адкуль мы атрымоўваем абсталяваньне для нашых заводаў. У далейшым мы павінны пашырыць вываз фруктаў, каб мець магчымасьць больш завозіць з-за мяжы прылады вытворчасьці.

У мінулым годзе Белсадсаюз паклаў пачатак тэхнічнай пераапрацоўкі яблык на цеста, якое адпраўляў у колькасьці 600 тон у нашы прамысловыя цэнтры; акрамя таго, больш 15.000 тон яблык штогодна спажываецца насельніцтвам БССР.

Савгаскі фруктовы сад.

Мы бачым, што плады, з аднаго боку, служаць добрымі харчамі для насельніцтва БССР і працоўных цэнтраў нашага саюзу, а з другога—прадметам экспарту на замежныя рынкі.

У бліжэйшае пяцігодзьдзе, нараду з аднаўленьнем старых садоў, намечана пашырэньне плошчы, каб у 1933 г. было 27.000 гэктараў садоў, г. з. павялічэньне амаль на 100 проц.

Значна пашырыць садоўніцтва неабходна ў буйных савгасах і калгасах, асабліва знаходзячыхся на блізкай адлегласьці ад чыгуначных і водных шляхоў зносін і ў прыгародных раёнах.

Пры закладцы новых садоў неабходна не дапускаць усіх недахопаў, якія перашкаджаюць разьвіцьцю садоўніцтва: 1) шматгатунковасьць, 2) вялікая колькасьць існуючых гатункаў, якая ня мае збыту на рынку, 3) кепская тэхніка догляду за садам, дзякуючы чаму сад прыходзіць у заняпад.

Раіцца рассадзіць прамысловыя гатункі: антонаўку, літоўскі пэпін, бабушкіна, чорнае дрэва, шрэйфліны, апорт, цітаўку і г. д.

У мэтах палепшаньня садовай тэхнікі Савецкай уладай адчынены сельска-гаспадарчыя тэхнікумы і каротка-тэрміновыя курсы. На працягу пяцігодкі мяркуецца пабудаваць да 15 заводаў па пераапрацоўцы садавіны, што дасьць магчымасьць насельніцтву карыстацца прадуктамі садоўніцтва на працягу значнай часткі году.

Але ўсе пералічаныя мерапрыемствы прынясуць вялікі прыбытак толькі пры дапамозе працоўнага насельніцтва, пры яго непасрэдным удзеле ў працы па насаджваньню новых і аднаўленьню старых садоў.

Пры звычайным доглядзе за садам патрабуецца да 210 рабочых дзён на *га* на працягу году.

Яшчэ да пачатку вясны пачынаюцца работы ў садох: зрэзка сухіх галін, збор сухіх лістоў з дрэў, у якіх знаходзяцца зародкі шкоднікаў, абчыстка мёртвай кары дрэў і змазка ствалоў вапенным малаком. Апырскваньне дрэў растворам жалезнага купаросу (на адно вядро вады бярэцца, прыкладна, тры фунты жалезнага купаросу) робіцца ў другой палове сакавіка, або ў першай палове красавіка месяца і зьнішчае на дрэвах мхі; струшваньне з дрэў на пасьцілкі кветкаеда, і такім чынам зьнішчэньне яго. Каб правесьці працу найбольш пасьпяхова, перад пачаткам барацьбы з кветкаедам трэба апырскваць вапенным малаком 9 дрэў з кожных дзесяці, адно застаецца свабодным, кветкаед ня любіць вапны і зьбіраецца на свабоднае ад вапны дрэва; з гэтага дрэва яго трасуць на пасьцілкі і тады паляць на агні.

Як толькі высахне глеба, сад угнойваюць і аруць. Перад распусканьнем бутонаў дрэвы апырскваюцца бардоскай вадкасьцю, пасьля цьвяценьня гэта апэрацыя паўтараецца і пры завязі пладоў (праз два тыдні пасьля другога апырскваньня) дрэвы апырскваюцца трэці раз.

Узворваючы сады, неабходна падтрымоўваць „чорны пар“, які зьнішчае пустазельле, захоўвае вільгаць. Пры належным даглядзе можна зьнішчыць усе недахопы садоў і падняць іх ураджайнасьць.

Часта садаводы скардзяцца на тое, што пры добрым даглядзе за садам усе-ж назіраецца яго зьнішчэньне. Калі сад пасаджан на кепскім месцы, тады і добры дагляд мала яму дапамагае. Неабходна пры выбары месца для пасадкі новага саду зьвярнуць увагу на тое, каб месца было добрае.

Сады пасьпяхова разьвіваюцца на вода-прапушчальных суглінках, пад глебаю не павінна быць пяску або лёгкага супеску. Месца лепшым лічыцца адхоннае (к паўдню або усходу), з добрым водасьцёкам, бо роўнядзь забалачваецца. Сады не ўжываюцца на мясцох з высокім узроўнем грунтавых вод, бо карэньні ў яблыні дасягаюць да 1,25 мэтр., а грушы да 2 м. глыбіны; косткавыя пароды (вішня) добра растуць на суглінках з значнай колькасьцю вапны, бо, пры адсутнасьці апошняй, дрэвы хварэюць і не даюць пладоў.

Такім чынам, усё неабходнае для разьвіцьця садоўніцтва БССР мае і належыць зьвярнуць выключную ўвагу, каб пяцігадовы плян па садоўніцтву быў выканан.

Я. Шаўкуноў.

БУДУЦЬ ТРАКТАР

На пабудову трактара чытачкі часопісі зав. „Праца“ сабралі 16 р. 50 к.

1. Рашал 2 руб.
2. Вальфсон 1 „
3. Жогаль 1 „
4. Кандумова 1 „
5. Дайхіна 1 „
6. Рэхтман 1 „
7. Чмых 1 „
8. Тайновіч 1 „
9. Хлябіч 1 „
10. Кароль 1 „
11. Чаўр 50 кап.
12. Шэйніна 50 „
13. Юрк'ян Ганна 50 „
14. Мазурэнка 50 „
15. Фрыдман 50 „
16. Пісецкая 50 „
17. Каліноўская 50 „
18. Каліноўская 50 „
19. Вальковіч 50 „
20. Крыловецкая 50 „
21. Мардусова 50 „

Дэлегацкі сход Старушак уносіць на пабудову трактара 2 р. 15 кап. Усе жанчыны, унесшыя грошы на трактар, выклікаюць дэлегацкія пункты і чытачак **Жыткавіцкага раёну** пасьледваць іх прыкладу і правесьці збор на пабудову трактара імя „Беларуская Работніца і Сялянка“.

Жыткавічы, Мазырскай акр.

Анюта.

Пабудуем трактар.

Работніцы савгасу Дукора пастанавілі зьбіраць сродкі на пабудову трактара імя „Беларускай Работніцы і Сялянкі“ ня толькі грашыма, але уціль-сыравінай.

Ужо ў савгасе сабрана 6 руб. грашыма. Збор яшчэ працягваецца.

Явар.

Жанчыны калгасу „Новае жыцьцё“ ўнесьлі грошы на пабудову трактара імя часопісі „Белрабсялянка“.

1. Асіповіч Варвара ўнесла 1 руб.
2. Дубіна Хвядора ўнесла 1 р.
3. Лізунак Домна ўнесла 20 к.
4. Сокал Пелагея ўнесла 1 р. 50 кап.
5. Солоха Ульяна ўнесла 50 к.
6. Дубіна Ульяна ўнесла 50 к.
7. Доморнацкая Яўхімья ўнесла 50 коп.
8. Супрончык Хрыстына ўнесла 50 кап.
9. Каўфман Фаня ўнесла 50 к.
10. Жукава Маня ўнесла 50 к.
11. Ждановіч Андрэй унёс 1 р.

І выклікаем пасьледваць нашаму прыкладу калгасьніц Дражэскага сельсавету.

Адказы на запытаньні.

Ці мае права жанчына насіць прозьвішча мужа, калі іх шлюб не зарэгістраваны ў Загсе?

Пры фактычным шлюбе супругі носяць кожны сваё прозьвішча, якое ён меў да шлюбу. Зьмяніць прозьвішча магчыма толькі аформіўшы гэта ў органах Загсу. Пры рэгістрацыі шлюбу кожны з супругаў мае права заставацца пад сваім ранейшым прозьвішчам, ці прыняць, па жаданьню, прозьвішча мужа, альбо жонкі.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА.

Хадасэвіч — Вершы ў нас друкуюцца толькі на беларускай мове, як і ўся часопісь.

Кавалёвай і Нядзелькі—Вершы слабыя—друкавацца ня будуць.

Трус, Горбаль і Гарановіч—Пісьма пасланы поштай.

Піонэру—Пішэце, як наладжана праца ва ўноў арганізаваных яcьлях.

Пяруну—аб актывістцы—напішэце ў насьценгазэту.

С. – „Загітавала жонка“—ня пойдзе. Не вядома дзе адбывалася гэта справа і наогул больш карысна паказаць удзел у гэтай справе усёй бядняцка-серадняцкай масы.

Пісарчыку—Частушкі не падыходзяць. Аб лікбезе і жанпрацы ў в. Жардоўка напішэце ў насьценгазэту.

Дубінец Просьцы—Аб зборы шышак—пераслана ў „Піонэр Беларусі“.

„Беларуская Работніца і Сялянка“

з студзеня 1930 году выходзіць 3 разы ў месяц.

Падпіску можна здаваць на пошту, лістаносцам, у кіёскі ці прысылаць непасрэдна ў рэдакцыю.

Часопісь каштуе— 1 месяц: . . . . 20 капеек | Паўгода. . . 1 р. 20 капеек
3 месяцы . . . 60 „ | Год . . . . 2 р. 40 „

Цана асобнага нумару 10 кап.

Упаўнаважаныя па падпісцы атрымоўваюць 10 проц. з сабранай сумы.

Кожная актывістка, грамадчыца, дэлегатка, работніца, калгасьніца, саўгасьніца, бяднячка і сераднячка—павінна чытаць сваю часопісь „БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА“.

Кожная актывістка павінна распаўсюджваць гэту часопісь.

Чытайце, распаўсюджвайце і пішэце ў сваю часопісь.

Адрас рэдакцыі: Менск, вул. Карла Маркса, 14, тэлефон—5-85.

524

ЦАНА АСОБН. НУМАРУ 10 кап.

НАДЗЕЙНЫ КОНЬ

(К прыбыццю ў Клімаўшчыну 30 трактараў).

Сонца выплыла з-за лесу,
Сьвет, цяпло палём панесла,
Хаты золатам заліла,
Песьціць куст, сьмяецца міла...

Сонца плаўна ў далі коціць.
Таты й мамы няма ў хаце.
Яны на палёх арцелі.
Цішка-ж смачна сьпіць ў пасьцелі.

... узьлез на самы блізкі плот.

Сонца ўзьнялася вышэй,
Праз вакно зірнула к Цішы;
Хлопчык ручкай працёр вочы,
Учуў: здалёк нешта лапоча.

Што за штука? Хто-та грае?
Цішка сам сабе параіў:
Апрануцца—і за дзьверы,
Каб пабачыць, каб праверыць,

Што галосна так лапоча,
Што бліжэй сюды ўсё крочыць?
А з сабою, на падмогу
Кліча дзетак у дарогу:

— Лекса, Юзік, Зося, Янка,
Юлька, Тэклечка і Ганка,
Ты прыгледзься, ты паслухай,
Мабыць, праўдзіць мае вуха.

Слухай, вось ўжо недалёка,
Некі ляскат, некі клёкат.
— Дзеці, я ўжо здагадаўся—
Цьвеліць Янка, больш за ўсіх:

Звонка крыкнуў: „САМАЛЁТ!"
Узьлез на самы бліжні плот.

А у небе сінім, чыстым,
Зьзяе сонца, бы маніста.

Самалёта—ані званьня...
Ды з музычнай песьняй раньню
У небе жаўранак павіс.
Янка з плоту скочыў ўніз.

— Не, ня тое, памыліўся,
Пабяжым у поле мы усе.
Нуце, дзеці, на дарогу!—
Замігалі дзетак ногі.

На дарозе, у пылу сівым,
Дзецянят сустрэла дзіва:
Без аброці, без пастромкаў,
Без сядла, на перагонкі,

Рэжуць зямлю зубцы шын
Трыццаці стальных машын.
— Знаю, знаю, што за коні;
То з заводаў нам сягоні

У горла ўлі вядзерца газы,
І пашоў служыць калгасам.
Больш прастору, мейсца болей
Ўперад, ўперад, шырэй поле!

Няма стомы, межы прэч —
Вось якая гэта рэч.
Трактар сее і малоціць,
Збажыной за працу плоціць,

Ўзарэ поле, жне і меле,
Яго ногі—не нямелі.
Ты пабач, як глыбы верне.
Барануй, сып у глебу зерня!

Трактар, выкуты заводам,
Лапаць падмяняе ботам.
Гэты конь ня дасьць прамаху
Кулакоў усіх саб'е са шляху

Нішчыць цемру, сьлёзы, голад,
Гэты конь—дзён нашых волат.

... І сказаў: „Надзейны конь!"

(Гаварыў настаўнік ў клясе)
Трактары прышлі калгасу.
— Трактар, трактар,—ну, пабачым,
Конь сядзіць у ім, ня йначай!..

— Вось дык Паўлік, ну — дзівак!
Ці то-ж конь пацягне так?
Гэты конь—сталёвы, дужы;
Ня есьць сена, ня п'е з лужы;

Ў руках тысяч і мільёнаў,
Цесна спаянай калёнай
Конь такі—сталёвай масьці
Прывядзе нас к сьвету, к шчасьцю.

„Так-так-так" сьцьвярджае трактар.
Цішкін дзед ўсьміхнуўся як та,
Ў люльку выкрасаў агонь
І сказаў: „НАДЗЕЙНЫ КОНЬ".

А. Г.

Выдавец—Аддзел работніц і сялянак ЦК КП(б)Б. *Рэдактары* { Н. Бурава. Г. Рагазіньнікава.

Друкарня БДВ імя Сталіна. Заказ № 1755 У ліку 17.500 экз. Галоўлітбел № 857.

ГПБ Ср. Аз.